**І. А. Катвіцкая,** *выкладчык*
*кафедры беларускай народнапесеннай*
*творчасці БДУ культуры і мастацтваў*

# СУЧАСНАЯ РАДЗІННАЯ ПЕСЕННАЯ ТРАДЫЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ: ПЫТАННІ СТЫЛІСТЫКІ

Абапіраючыся на назіранні і даследаванні фалькларыстаў і этнамузыколагаў у сферы стылістыкі ў музычным фальклоры, на сучасным этапе становіцца магчымым найбольш поўна асвятліць пытанне аб стылістыцы радзіннай этнапесеннай традыцыі. На тэрыторыі Беларусі гэты феномен аўтэнтычнай культуры існуе ў жывых формах, дзякуючы чаму аўтар мае магчымасць глыбока і ўсебакова прадставіць праблематыку на аснове ўласнага палявога вопыту і сфарміраванага слыхавога ўспрымання жывой хрэсьбіннай інтанацыі.

Пад стылістыкай радзіннай песеннай традыцыі мы, улічваючы разнастайнасць падыходаў даследчыкаў да дадзенай навуковай праблемы, маем на ўвазе ўсе катэгорыі музычных стыляў, рысы якіх магчыма пачуць у этнічных спевах радзінных песень і вывучаць у наш час як жывую традыцыю.

У сістэме беларускага песеннага фальклору жанр радзіннай[1] песні ў жывым інтанаванні вылучаецца з астатніх жанраў каляндарнага і сямейнага абрадавых цыклаў. Гэтае адрозненне акрэсліваецца комплексам стылявых рыс, што ўласцівы менавіта радзіннай абраднасці, гэта значыць радзіннай стылістыкай.

Асэнсаванне стылістыкі радзіннай песні праходзіць праз асэнсаванне яе інтанацыйнай прыроды. Так, самі народныя выканаўцы гавораць "хрэсьбінны голас", песня "толькі хрэсьбінная, на вяселле – другі голас" (Ушацкі раён), "калядам свае песні, купаллю свае, хрэсьбінам – свае" (Пастаўскі раён), "хрэсьбіны яўныя" (Лепельскі раён). Але і калі спяваюць па парадку ўсе розныя, але тыповыя для сваёй мясцовасці "хрэсьбіны", тлумачаць – "у нас ўсе хрэсьбіны спяваюцца на адзін голас", "хрэсьбіны адным тонам пяюць" (Ушацкі раён). З гэтага відаць, што ў семантыку "хрэсьбіннага голасу" закладваецца агульнасць двух

[1] "Радзінны", "хрэсьбінны" і "радзінна-хрэсьбінны" выкарыстоўваюцца намі ў дадзенай публікацыі як тоесныя паняцці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прынцыпова важных, з пункту гледжання этнамузыколагаў, паняццяў: радзінная інтанацыя і радзінны тыповы напеў.

“Хрэсьбінны голас” у сэнсе хрэсьбіннай інтанацыі аб’ядноўвае ў свядомасці носьбітаў на ўзроўні жывога інтанавання комплекс характэрных толькі для радзіннага цыкла катэгорый, такіх як унікальная інтанацыя і мелодыка, ладавыя, рытмічныя і стылістычныя асаблівасці. Таксама праз паняцце “голас” народныя спевакі вылучаюць і дакладна прымеркаваныя да пэўнага часу і абставін тыповыя політэкставыя напевы, якія выконваюць ролю знака-сімвала таго ці іншага рытуалу.

Масіў абрадавых песень з характэрным інтанацыйным каларытам ствараe своеасаблівае інтанацыйнае поле радзін, у межах якога функцыянуе радзінная песенная сістэма.

Ядро песеннай сістэмы беларускіх радзін[2] складаецца з абрадавых напеваў, якія маркіруюць галоўных персанажаў абраду: парадзіху, бацьку дзіцяці, бабку-павітуху, кумоў. Спецыфіка радзіннага комплексу ўвасоблена ў стылістычнай неаднароднасці песеннага ядра, таму напевы “бабке, бацьке, кумам” маюць абрадавы модус песеннай стылістыкі, у той час як напевы “парадзісе”, “хрэсьбіны маці”, “песні радзісе” кадзіруюцца лірычным модусам стылістыкі, што вельмі блізкі да раннетрадыцыйнай лірыкі. Такі склад ядра вызначае заканамернасці функцыянавання ўсяго радзінна-хрэсьбіннага песеннага масіву, а знаходжанне лірыкі ў самім рытуале “адчыняе” каналы пранікнення ў абрад і непрымеркаванай лірыкі, больш за тое – робіць іх сувязь заканамернай і арганічнай. Напевы “ядра” валодаюць яскрава выяўленай абрадавай інтанацыяй, строгай рытмаформулай і поліфункцыянальнасцю, што ўласціва тыповаму напеву.

Наступная па значнасці група – напевы двайной функцыі. Гэтыя напевы выконваюцца на радзінах ці хрэсьбінах, аднак спалучаюць стылістычныя канатацыі як абрадавых, так і бяседных напеваў. Сярод іх “расходныя” і песні “бацькам” нованароджанага.

[2] Падрабязна тыпалагічная сістэматызацыя радзінных напеваў апісана аўтарам у наступнай публікацыі:: *Катвіцкая, І.* Тыповыя напевы беларускага радзіннага абраду і тэрыторыі іх пашырэння // *Этнапесенная* традыцыя Беларусі ў даследаваннях маладых музыказнаўцаў: навук. працы / Беларуская дзяржаўная акадэміяі музыкі. – Мн., 2006. – Вып. 11.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Апошняя група ўяўляе пласт пазаабрадавых, бяседных напеваў, якія выконваюцца на радзінах і хрэсьбінах. Іх наяўнасць абгрунтавана блізкасцю да абраду па тэматыцы і эмацыянальнай сферы, а іх прысутнасць абумоўлена вышэйуказаным фактарам спецыфічнасці ядра. Значнасць гэтых напеваў павялічваецца на тэрыторыях, дзе формульныя напевы сустракаюцца зрэдку і маюць рассеянае распаўсюджанне. Стыль мелодыкі гэтай групы роднасны напевам ранняй лірыкі.

Такім чынам, у аспекце гіторыка-стылявой тыпалогіі стыль радзінна-хрэсьбінных напеваў можа быць абрадавым і лірычным[3].

Індывідуальны выканаўчы стыль радзінных песень не адназначны: пеўчая манера, характар гуказдабывання, тэмбры і “вакальна-тэхнічныя” прыёмы разнастайныя. Усё ж некаторыя агульныя ўстаноўкі магчыма вылучыць: артыкуляцыйны апарат заўсёды ў моўным палажэнні, інтанаванне ў спадручным рэгістры для народнага сярэдняга (па вышыні) жаночага голасу, часцей за ўсё рэзаніраванне бліжэй да змешанага (ад груднога да мікставага), па якасці тэмбру – бліжэй да “галосных спеваў” на адкрытай прасторы. Самі напевы без багацця “спецэфектаў”: зрэдку сустракаюцца мелізмы, глісанда, скідванні, фаршлагі, трэмаланда, гэта значыць даволі прамалінейнае, часам бліжэй да “схематычнага” выкананне мелодыі. Сустракаюцца і выключна віртуозныя імправізацыі ў сэнсе арнаментыкі як меладычнай, так і рытмічнай.

Супольныя, гуртавыя спевы адлюстроўваюць мясцовыя рэгіянальныя стылявыя традыцыі. На Паазер’і радзінныя напевы манадыйныя, за рэдкім выключэннем магчыма сустрэць сціслую гетэрафонную ўспышку ў тэрцыю ці кварту або, як, напрыклад, у Пастаўскім раёне гучыць канон: “пяюлі” падзяляюцца на дзве групы, першая спявае (ва унісон) першы куплет, другая група – другі. Такое прынцыповае аднагалоссе з’яўляецца ўстойлівым для ўсіх жанраў у этнакультуры Паазер’я. На тэрыторыях, якім уласціва поліфанія, радзінныя напевы выконваюцца ў стылях рэгіёнаў: на Падняпроў’і – гетэрафанія пры сугуччы секунд і паралельных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[3] Выкарыстанне абрадавых ці лірычных інтанацый магчыма прадставіць як падсвядомы, але ўсё ж такі выбар. Патрэба структурыраваць абрад патрабуе напружання, перш за ўсё эмацыянальнага, якое завяршаецца заканамернай рэлаксацыяй, спадам. Таму прысутнасць бяседных напеваў і тэкстаў можна прадставіць як неабходнасць, каб працэс рытуалу быў лагічна завершаны.

тэрцый пры апоры на унісонныя спевы, на поўдні Міншчыны і бліжэй да Палесся – шчыльнае па фактуры трохгалоссе з падводкай.

Па меры аддаленасці ад Лепельскага арэала[4] стылістыка напеваў падпадае пад экспансію сферы пазаабрадавай лірыкі: рытмічная структура размываецца з зацягваннем розных долей, мелодыя становіцца больш распетай, павялічваецца колькасць унутрыскладовых распеваў, фаршлагаў, запаўнення скокаў і тэрцыевых ячэек паступовым рухам. Набліжэнне да маргінальных зон адзначана знікненнем абрадавай напружанасці гучання і пераходам да больш мяккага лірычнага выканання, а таксама і традыцыяй шматгалосых распеваў.

Увогуле для выканальніцкага стылю абрадавых напеваў характэрны унутраная пругкасць, пульсіруючы рытм. Калі-нікалі ўзнікаюць дзве рытмічныя лініі: першая – лінія метрарытмічных націскаў, другая – лінія, што прытрымліваецца логікі інтанацыйных акцэнтаў, вылучаецца пры спевах акцэнтамі, якія час ад часу нават падкрэсліваюцца, як удары нагой па падлозе пры спевах.

У цэнтры Паазерскага арэала праслухоўваецца тэндэнцыя да акругленага гуку: кадансавыя гукі вытрымліваюцца, а галосныя ў іх інтануюцца не шырока адчыненымі, а нібы нейтральнымі – *і* пераходзіць ў *е*, *а* ў сярэдні варыянт паміж *а*-*о*-э. У аспекце характару гуку абрадавыя радзінныя песні выконваюцца ў высокай пазіцыі, гэта значыць манера гуказдабывання бліжэй да каляндарнай абраднасці (спевы на адкрытых абшарах, а не “для сябе”).

Выканальніцкі стыль прымеркаваных да радзінных бяседных песень адрозніваецца ад абрадавых. Гэта цэлы пласт пазаабрадавых напеваў, якія выконваюцца на адведках і хрэсьбінах і займаюць значнае месца ў радзіннай песеннай традыцыі Беларусі.

Сучасныя ўмовы жыцця, а менавіта экспансія гарадской культуры, што разбурае сялянскі ўклад побыту, у асяроддзі якога здзяйсняюцца абрадавыя каноны, вельмі паўплывалі на стан традыцыі. Працэс урбанізацыі адбіўся не толькі на перыферыі традыцыі, але і на становішчы ў рэгіёнах, дзе “хрэсьбінныя” напевы

[4] Лепельскі арэал з'яўляецца цэнтрам радзіннай песеннай традыцыі ў Беларусі. Гл.: *Катвіцкая,І.*Тыпавыя напевы беларускага радзіннага абраду і тэрыторыі іх пашырэння // *Этнапесенная* традыцыя Беларусі ў даследаваннях маладых музыказнаўцаў: навук. працы / Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі. – Мн., 2006. – Вып.1. – С. 93.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

існуюць і сёння. Эфект "запамінання" магчыма фіксаваць і ў блізкім да цэнтра песеннай традыцыі Ушацкім раёне. На пытанне аб "хрэсьбінных" песнях інфарматары адказвалі: "...каб спяваў многа, а так ўжо год 20 не пяём", "...пелі такія песні, але я іх ня памятаю".

Такі вакуум запаўняецца песнямі лірычнымі, бяседнымі, што далучаюцца да абраду па прынцыпу блізкай тэматыкі. У асноўным гэта матывы жаночага лёсу, жаночай долі, шлюбу і сямейных адносін. Такая паэтычная арыентацыя знітавана з вобразам радзіхі, шырэй, замужняй жанчыны. Таму вялікай папулярнасцю карысталіся тыя песні, у якіх спявалася пра цяжкае жыццё далёка ад роднай хаты, ад "айца з мацер'ю". Так тлумачаць і самі выканаўцы: "...дык гэтых (хрэсьбінных песень. – *І.К.*) песень мала, а пеяць жа нада" (Расонскі раён), "Старыя бабкі пелі толькі хрэсьбінныя, а зараз пяюць усякія" (Лепельскі раён), "Дык нада ж многа піяць, дзе ж гэтых хрэсьбін набярэшся" (Расонскі раён). Магчыма, з часам семантыка рытуальнага напеву страчваецца і акцэнт пераносіцца на паэтычны змест.

На сучасным этапе рэалізуецца працэс "прыцягвання" бяседных напеваў у абрад і замацаванне за імі функцыі абрадавых "толькі на хрэсьбіны", асабліва у перыферыйных раёнах. Большую частку складаюць напевы з устойлівай складовай і рытмічнай структурай, пры гэтым стылістыка інтанавання відавочна пазаабрадавая, а характар выканання мае рысы індывідуалізаванасці і імправізацыйнасці.

Інтанацыйна-меладычныя і паэтычныя характарыстыкі бяседных напеваў знаходзяцца ў сферы пазаабрадавай лірычнай сферы і з'яўляюцца падмуркам для іх выканання ў сямейна-абрадавай застольнай традыцыі. Мелодыі гэтых напеваў блізкія па гучанні напевам ранняй лірыкі.

Такім чынам, стылістыка радзінна-хрэсьбіннага напеву – з'ява шматузроўневая і злучае ў сабе стылі з улікам сваёй спецыфікі: гісторыка-стылявы (з падзелам на пласты абрадавай і пазаабрадавай музыкі) і выканальніцкі (абагульняе рэгіянальную спецыфіку вакальнай культуры). Рэгіянальная ж стылістыка радзінных напеваў высвятляецца праз індывідуальны (сольнае выкананнне) і супольны (гуртавыя спевы) стылі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ